ГАЗЕТА З БЕЛАРУСІ

ГОЛАС РАДЗІМЫ

ВЫДАЕЦЦА З 1955 ГОДА ● NO.30 (3246) ● ЧАЦВЕР, 11 ЖНІЎНЯ, 2011

ШТОТЫДНЁВІК “ГОЛАС РАДЗІМЫ” МОЖНА ЧЫТАЦЬ У ІНТЭРНЭЦЕ: **WWW.GOLAS.BY**

Летапіс без белых плямаў

Унікальная выстава арыгінальных дакументаў 90-гадовай даўнасці пра гісторыю беларускай дыпламатыі адкрылася ў цэнтры гісторыі Міністэрства замежных спраў Беларусі і беларускай дыпламатычнай службы Стар. 2

Знічкі Айчыны

Стар. 3

Яскравыя танцы на Замкавай гары

Фестываль вярнуў Мсціслаў у Сярэднявечча

Стар. 4

Прэм’ера рубрыкі: **ДАЛЯГЛЯДЫ СЯБРОЎСТВА**

Жытнёвы сноп ад роднай нівы

Тальяцінскія беларусы павезлі з сабой з Бацькаўшчыны на Волгу незвычайны і вельмі сімвалічны падарунак

Кацярына Мядзведская

Гэтае знаёмства пачалося дзякуючы настойлівасці беларусаў з Тальяці: яны шукалі надзейных партнёраў на Радзіме. Урэшце выйшлі на адміністрацыю Ваўкавыскага раёна Гродзеншчыны. Заключылі дамову аб супрацоўніцтве, спланавалі сумесныя праекты, сустрэчы. Сёлета з расійскага Паволжа ў Ваўкавыск на Дзень горада прыехалі два творчыя калектывы — жаночы ансамбль “Купалінка” і дзіцячы “Зорачкі”. Шмат ураджаяў засталося пасля наведвання Бацькаўшчыны ў сэрцах суайчыннікаў. “Шмат якія рэчы мяне па-добраму здзівілі ў Беларусі, — прызнаецца салістка гурта “Купалінка” Людміла Плаксіна. — Жывуць тут, адчуваецца, людзі ўпэўнена, спакойна. Спадабалася, як шчыра і сардэчна праходзіла свята горада. Цікава было бачыць, напрыклад, як машыніст-чыгуначнік грае на саксафоне і спявае частушкі пра ваўкавыскіх дзяўчат. А супрацоўніца мясцовага райвыканкама прысвяціла вершы Ваўкавыску. Кранула і тое, што для пажылых, ветэранаў перад сцэнай былі пастаўлены крэслы. На вуліцах — чыста, утульна і ўсё — у кветках!”

Уразілі тальяцінскіх сяброў і крэйдавыя кар’еры ў ваколіцах Ваўкавыска, і Цэнтр рамёстваў у пасёлку Рось: у ім дзеці займаюцца ткацтвам, лоза- і саломапляценнем, вучацца майстэрству керамікі. Менавіта там землякі набылі шмат сувеніраў — саламяных лялек, льняных ручнікоў, гліняных глечыкаў. “Цяпер у нас шмат экспанатаў для выстаў, якія мы часта ладзім у Тальяці”, — радуецца намеснік старшыні нацыянальна-культурнай аўтаноміі “Нёман” Людміла Бабарыкіна. Асабліва спадабалася ў цэнтры народнай творчасці дзецям: дзяўчынак увогуле было не адцягнуць ад кроснаў, некаторыя нават самі спрабавалі на іх ткаць. Калекцыю беларускіх рэчаў тальяцінцаў папоўніла і вялікая лялька у нацыянальным строі, яе падарылі ў Ваўкавыскім райвыканкаме. А пасля выступлення ў вёсцы Леснікі, што недалёка ад Ваўкавыска, артыстам уручылі, бадай, самы каштоўны падарунак — вялікі жытнёвы сноп, сімвал новага ўраджаю. ➔ Стар. 2

Хлеб ды соль беларусам з Тальяці на роднай зямлі

ПІШУЦЬ ЗЕМЛЯКІ

Імёны з ваенных зводак

Беларусы Данеччыны збіраюць матэрыялы пра суайчыннікаў, якія ў гады Вялікай Айчыннай вайны змагаліся з фашыстамі на ўкраінскай зямлі

У рэдакцыю звярнулася старшыня Данецкай абласной грамадскай арганізацыі “Культурна-асветніцкае таварыства беларусаў “Нёман” Сафія Пасынкава. Яна нагадвае, што ў суполцы, створанай дзесяць гадоў таму, шануюць гісторыю, традыцыі, культуру беларускага народа і яго мову. Нашы землякі наладжваюць стасункі з іншымі этнасупольнасцямі рэгіёна, садзейнічаюць развіццю эканамічных, навуковых, культурных сувязяў паміж украінскай Данеччынай і Беларуссю. Асаблівая ж увага ў суполцы надаецца рабоце з ветэранамі Вялікай Айчыннай вайны. Таму штогод там праходзяць акцыі, мерапрыемствы па іх ушанаванні, выдадзена і кніга “У памяці захоўваем...”.

“Многія нашы землякі-беларусы загінулі, абараняючы ад фашыстаў Данбас і вызваляючы гэту зямлю, — піша Сафія Пасынкава. — Аднак лёсы, імёны тых салдатаў, што тут пахаваныя, пакуль што малавядомыя ці нават зусім невядомыя. Мы правялі папярэдні прагляд дакументаў — а гэта спісы па ваенкаматах, каля сотні сшыткаў з імёнамі загінулых воінаў у абласным рэгіянальным аб’яднанні “Пошук”, спісы памерлых у шпіталях... — і высветлілі: усяго каля тысячы беларусаў маглі загінуць тут, памерці ў шпіталях ці фашысцкіх лагерах”. ➔ Стар. 2

Па-сучаснаму – хутка і зручна

Анастасія Сярова

Беларуская чыгунка надае вялікую ўвагу развіццю міжнародных, рэгіянальных і гарадскіх ліній

Калі гаварыць пра гарадскія лініі, канкрэтныя крокі ў гэтым кірунку ўжо зроблены: паміж станцыямі Мінск-Пасажырскі і Беларусь курсіруюць сучасныя электрацягнікі швейцарскай кампаніі Stadler. “У будучыні падобныя лініі будуць створаны на Смалявіцкім і Пухавіцкім кірунках, — паведаміў намеснік начальніка пасажырскай службы Беларускай чыгункі Аляксандр Беластоцкі. — Такія цягнікі стануць выконваць функцыі наземнага метро: пасажыры максімальна хутка змогуць перасаджвацца на іншыя віды транспарту”. Адпаведныя транспартныя вузлы з'явяцца на прыпыначных пунктах чыгункі Мінск-Паўночны, Мінск-Усходні і Масюкоўшчына, дзе ў перспектыве плануецца будаўніцтва двухузроўневай транспартнай развязкі.

Позірк без стэрэатыпаў

Альбом-даведнік “Адбіткі незабытай зямлі” расказвае пра раёны, якія сёння адраджаюцца пасля аварыі на Чарнобыльскай АЭС

Выпуск альбома-даведніка прымеркаваны да 25-й гадавіны катастрофы на Чарнобыльскай АЭС. Выданне змяшчае больш за 150 фатаздымкаў. У ім — малюнкі Свята-Мікалаеўскай царквы Лунінецкага раёна, пабудаванай без адзінага цвіка, і фатаграфіі іконы Баркалабаўскай Маці Божай Адзігітрыі, якую лічаць шэдэўрам беларускай школы іканапісу XVII стагоддзя і якая захоўваецца ў Быхаве. На старонках выдання — і цырымонія старажытнага народнага абраду “Пахаванне стралы”.

Над унікальным праектам працавалі журналісты, дызайнеры і гісторыкі-краязнаўцы. Іх мэтай было прадэманстраваць гісторыка-культурныя і прыродныя каштоўнасці пацярпелых тэрыторый, іх унікальнасць, самабытныя традыцыі і людзей — носьбітаў гэтых традыцый. У сваёй працы яны не прытрымліваліся стэрэатыпаў аб чарнобыльскай зоне, а наадварот імкнуліся паказаць, што пацярпелыя ад аварыі рэгіёны дынамічна развіваюцца і адраджаюцца.

“Мы — беларусы з Тальяці!” Фотаздымак на памяць у Ваўкавыску ля фантана

Прэм’ера рубрыкі: **ДАЛЯГЛЯДЫ СЯБРОЎСТВА**

Жытнёвы сноп ад роднай нівы

(Заканчэнне. Пачатак на стар. 1)

“Штогод мы адзначаем Дажынкі, — радуецца Людміла Бабарыкіна. — Заўсёды была праблема: дзе ўзяць каласкі. Цяпер у нас ёсць сапраўдны вялікі сноп ды яшчэ і старанна ўпрыгожаны кветкамі-васількамі! Мы яго высушым і абавязкова захаваем. Гледзячы на яго, будзем узгадваць ветлівых сяльчан з вёскі Леснікі, якія так рыхтаваліся да сустрэчы з намі — прыбіраліся, пяклі каравай…”

Пэўна, леснікоўскі сноп будзе сёлета ў Тальяці вельмі дарэчы. На Дажынках у расійскім Паволжы ён адыграе ці не галоўную ролю. “Як прыедзем — адразу пачнем рыхтавацца да восеньскага свята збору ўраджаю, — дзеліцца планамі Людміла Бабарыкіна. — Мы заўсёды чытаем, глядзім па тэлебачанні, як праходзяць Дажынкі ў Беларусі, потым праводзім і свае. Летась, напрыклад, была ў нас на свяце такая дзеючая асоба: Талака, гэткая царыца палёў. Баба-Багатуха, якая прыходзіла з дарамі восені. Ладзілі вялікую выставу той гародніны, што самі вырасцілі на дачных участках, гатавалі дранікі. А нашы танцоркі з ансамбля прыгожа выконвалі абрадавы танец “Жнейкі”. Самі шылі касцюмы для яго — спадніцы ў клетку, белыя кофтачкі, фартушкі і хустачкі. Сёлета ж будзе яшчэ цікавей: прыедуць госці з Самарскай вобласці, запрашаем таксама і сяброў з Беларусі — з Ваўкавыска, з таварыства па сувязях с суайчыннікамі за мяжой “Радзіма”, Рэспубліканскага цэнтра нацыянальных культур”.

А вось у будучым годзе землякі з Тальяці збіраюцца святкаваць Дажынкі ў Ваўкавыску. Запрашэнне на раённае свята ўраджаю 2012 года яны ўжо атрымалі. “Кантакты з тальяцінскім аб’яднаннем беларусаў “Нёман” у нас рознабаковыя, — адзначае супрацоўніца Ваўкавыскага райвыканкама Святлана Вараніца. — З гастролямі пабываў у Паволжы наш раённы ансамбль народнай музыкі і песні “Уладары”, артыстаў там вельмі цёпла сустракалі. І мы шмат экскурсій наладзілі для расійскіх сяброў, паказалі адметныя мясціны горада і раёна. Летась яны прыязджалі да нас на купальскае свята”.

Вядома, што Тальяці — буйны цэнтр расійскага Паволжа, там актыўна развіваецца аўтамабільная і хімічная прамысловасць. Таму, гаворыць Святлана Вараніца, цікава ў перспектыве наладзіць з дапамогай суайчыннікаў гандлёвыя і эканамічныя стасункі з тальяцінскімі прадпрыемствамі і бізнесменамі. Ваўкавыск жа, у сваю чаргу, можа быць цікавым для расіян сваёй мясамалочнай прадукцыяй.

Сяброўства заўсёды стаіць у адным радзе з любоўю. Ёй ганарацца, яе берагуць. Менавіта з сябрамі мы адзначаем самыя галоўныя падзеі ў жыцці, разлічваем на іх падтрымку ў цяжкія моманты, разам здзяйсняем самыя неверагодныя пачынанні. А калі ўявіць, што сяброўства існуе не толькі паміж канкрэтнымі людзьмі, але і цэлымі арганізацыямі? Колькі ўсялякіх цікавых ідэй можна ажыццявіць!

З гэтага нумара, як вы заўважылі, мы распачалі новую рубрыку “Далягляды сяброўства”. Калі ў вас ёсць прыклады паспяховага супрацоўніцтва з рэгіёнамі на Радзіме, дасылайце пра гэта лісты ў рэдакцыю.

Летапіс без белых плямаў

Унікальная выстава арыгінальных дакументаў 90-гадовай даўнасці пра гісторыю беларускай дыпламатыі адкрылася ў цэнтры гісторыі міністэрства замежных спраў і беларускай дыпламатычнай службы

Ірына Гардзіенка

Тэматычная выстава прысвечана 90-годдзю ўтварэння Паўнамоцнага прадстаўніцтва Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі пры Савеце народных камісараў Расійскай Сацыялістычнай Федэратыўнай Савецкай Рэспублікі (першае дыпламатычнае прадстаўніцтва БССР за мяжой) і зацвярджэння Палажэння аб Народным камісарыяце па замежных справах БССР. Экспазіцыя ўключыла ў сябе каля паўтары тысячы дакументаў пра гэтыя і іншыя падзеі ў гісторыі беларускай дыпламатыі.

У тым ліку на выставе прадстаўлены дакументы аб падпісанні Рыжскага мірнага дагавора, першая самастойная нота Народнага камісарыята, а таксама першыя беларускія замежныя пашпарты.

“Дакументы ўнікальныя не толькі таму, што вяртаюць да падзей 90-гадовай даўнасці, але дазваляюць, перш за ўсё, мінімізаваць белыя плямы ў гісторыі міжнародных адносін таго часу”, — адзначыў начальнік гістарычна-архіўнага аддзела Міністэрства замежных спраў Беларусі Вадзім Свярчкоў. Па яго словах, частка з прадстаўленых дакументаў узята з уласнага архіва МЗС, а частка прадастаўлена ў часовае карыстанне Дзяржаўнай архіўнай службай.

Гэтая выстава з’яўляецца своеасаблівым вынікам працы, якую на працягу апошніх некалькіх гадоў вядзе Міністэрства замежных спраў па фарміраванні базы дадзеных дакументаў па гісторыі знешніх сувязяў. На аснове сабраных матэрыялаў нярэдка рыхтуюцца публікацыі і навуковыя працы.

На адкрыцці выставы міністр замежных спраў Беларусі Сяргей Мартынаў звярнуўся да супрацоўнікаў МЗС, каб яны таксама ўносілі пасільны ўклад у фарміраванне гісторыі беларускай дыпламатыі.

БЕЛТА

На выставе шмат унікальных дакументаў

ПІШУЦЬ ЗЕМЛЯКІ

Імёны з ваенных зводак

(Заканчэнне. Пачатак на стар. 1)

Нашы землякі ўжо вядуць даследчыя работы — шукаюць дадзеныя пра загінулых суайчыннікаў. Пры гэтым выяўлены шэраг цікавых фактаў. Аднак узніклі і складанасці. Усяго на тэрыторыі Данеччыны загінула каля 80 тысяч воінаў, прычым яны пахаваны прыкладна ў тысячы розных месцаў — як па адным, так і масава. Акрамя таго, там памерла і пахавана каля 75–80 тысяч ваеннапалонных. На жаль, спісы загінулых пакуль што не ўпарадкаваны па алфавіце, месцах прызыву ў армію, у іх нямала паўтораў. А ў многіх спісах указаны толькі прозвішчы. Таму энтузіястаў чакае велізарны аб’ём работы: каля 30 тысяч прозвішчаў трэба супаставіць са звесткамі, якія ўжо ёсць на розных сайтах у інтэрнэце, з базай дадзеных Цэнтральнага архіва Міністэрства абароны СССР і іншымі дакументальнымі крыніцамі.

ІВАН ЖДАНОВІЧ

Сафія Пасынкава ў Мінску

“Канчатковая ж мэта гэтай велізарнай працы — выдаць кнігу “Беларусы — абаронцы Данбаса”, паведамляе С. Пасынкава. — Мы плануем, што ў ёй будуць указаны імёны і прозвішчы, даты і месцы нараджэння, а таксама месцы пахавання загінулых воінаў-беларусаў. Будзе пададзена і апісанне баявых дзеянняў на тэрыторыі вобласці з пералікам баявых часцей і злучэнняў, якія ў іх удзельнічалі”.

Сафія Пасынкава просіць праз газету адгукнуцца ўсіх, хто можа дапамагчы ў пошуках, успамінамі, дакументамі, а таксама сродкамі на выданне кнігі. Гэта могуць быць як арганізацыі, так і прыватныя асобы. Нашы землякі спадзяюцца, што і ў Беларусі, і па-за яе межамі ёсць нямала людзей, каго зацікавіць гэты праект беларусаў Данеччыны — найперш па доўгу памяці перад пакаленнем пераможцаў, уласных дзядоў і бацькоў.

Да ініцыятараў праекта можна пісаць на электронны адрас: **neman.belarus@gmail.com**

Дарэчы

У нашай пошце не рэдкасць падобныя лісты, калі землякі ў розных краінах зацікаўлены ў наладжванні рознабаковых сувязяў з такімі ж сацыяльна актыўнымі людзьмі з беларускіх суполак у іншых краінах. Гэта неабходна ім і для абмену вопытам работы, і для каардынацыі культурна-асветніцкіх ды іншых значных праектаў. Асабліва ж актывізаваліся такія кантакты пасля правядзення Першага фестывалю мастацтваў беларусаў свету. Таму мы маем намер з наступнага нумара пад рубрыкай “Талака” падаваць кароткую інфармацыю пра замежныя суполкі беларусаў, іх асноўныя кірункі дзейнасці.

Звяртаемся да ўсіх кіраўнікоў суполак, што зацікаўлены ў такім абмене інфармацыяй: дасылайце звесткі пра сябе ў рэдакцыю на наш электронны адрас — golas_radzimy@tut.by — і мы дапаможам вам у пошуках сяброў і аднадумцаў.

Сёння нас чакае падарожжа па мясцінах, якія звязаны з жыццём і дзейнасцю слаўнага сына зямлі беларускай Андрэя Тадэвуша Банавентуры Касцюшкі. А дапаможа здзейсніць гэтую віртуальную вандроўку новы творчы праект Уладзіміра Ліхадзедава — кніга "Тадэвуш Касцюшка на старых паштоўках і ў графіцы". Яна толькі што пабачыла свет у выдавецтве "Тэхналогія", а днямі ў Бібліятэцы Кангрэса ЗША ў Вашынгтоне адбылася прэзентацыя ўнікальнага альбома мінскага калекцыянера.

Кобрын. Помнік Т. Касцюшку. 1930 г.

Знічкі Айчыны

Кракаў (Польшча). Прысяга Тадэвуша Касцюшкі. 24 сакавіка 1794 г.

Любешаў (Украіна). Былы манастыр піяраў, дзе з 1755 па 1760 год вучыўся Тадэвуш Касцюшка. 1920-я гг.


Цар Павел I наведвае Т. Касцюшку ў турме

Вашынгтон, Джэферсан і Касцюшка

Алесь Карлюкевіч

Нарадзіўся будучы ваеначальнік, будучы кіраўнік паўстання 1794 года ў фальварку Мерачоўшчына паблізу Косава (цяпер горад Косава Івацэвіцкага раёна Брэсцкай вобласці). І было гэта на пачатку 1746-га ці напрыканцы 1745 года. Хрысцілі хлопчыка ў касцёле Косава. У 1754 годзе Тадэвуш вучыўся ў Берасці ў езуіцкім калегіуме. Затым — некалькі гадоў вучобы ў Любешаве (Новым Дольску). Тады гэта быў Пінскі павет, цяпер — тэрыторыя Украіны. Усе згаданыя мясціны ёсць на паштоўках, якія ўвайшлі ў кнігу. Лёс Тадэвуша Касцюшкі склаўся такім чынам, што вайсковую адукацыю ён атрымаў у Варшаве і Парыжы. А пасля вяртання з Францыі месца для службы ў Рэчы Паспалітай нашаму суайчыннику, на той час — дасведчанаму ваеннаму інжынеру-фартыфікатару, не знайшлося. Касцюшка пакідае межы краіны і адплывае ў Амерыку, каб змагацца за незалежнасць паўночнаамерыканскіх калоній Англіі.

30 жніўня 1776 года ён падаў Кангрэсу свой "Мемарыял". Спачатку афіцэр знаходзіўся ў чужаземным войску ў якасці валанцёра, а 18 кастрычніка таго самага года Кангрэс залічыў яго ў армію ў чыне палкоўніка. І амерыканцы не памыліліся. Ужо восенню 1776 года наш зямляк стварае сістэму ўмацаванняў на берагах ракі Дэлауэр, будуе форт Білінгспорт. У наступным годзе атрымлівае пасаду вайсковага інжынера ў Паўночнай арміі. Займаецца фартыфікацыяй гарадоў і вайсковых лагераў. Літаральна на ўсіх участках баявых дзеянняў Касцюшка праяўляе дальнабачнасць, паказвае сябе не толькі таленавітым вайсковым тактыкам, але і ваеначальнікам, здольным прадбачыць стратэгію дзеянняў. Асаблівую славу здабыў сабе палкоўнік у бітве пад Саратогай. У 1778 годзе Джордж Вашынгтан загадаў Касцюшку ўмацаваць форт Уэст-Пойнт. Як вынік — стварэнне магутнай цытадэлі.

У красавіку 1783 года вайна за незалежнасць закончылася падпісаннем Парыжскай мірнай дамовы. Вялікая заслуга ў паспяховым змаганні амерыканцаў за сваю свабоду належыць і нашаму земляку, якому ў тым жа 1783 годзе Кангрэс ЗША прысвоіў званне брыгаднага генерала. Атрымаўшы пажыццёвую пенсію і надзел зямлі ў 250 гектараў непадалёк ад горада Калумбус (штат Агаё), Касцюшка ўсё ж вярнуўся на радзіму. А ў Амерыцы і цяпер многія мясціны сведчаць пра повязь з гэтай краінай нашага суродзіча. На паштоўках з калекцыі Уладзіміра Ліхадзедава адлюстраваны помнікі ваеначальніку ў Вашынгтоне і Чыкага, "Дом Касцюшкі" ў Віноне-Лэйк, парк імя Касцюшкі ў Мілуокі, а таксама — школа імя ўраджэнца Беларусі і пошта, якія размешчаны ў горадзе Касцюшкі.

Дарэчы, забягаючы наперад, заўважу, што каштоўнасць кнігі Уладзіміра Аляксеевіча Ліхадзедава яшчэ і ў тым, што ён дапамагае здзейсніць падарожжа па мемарыяльных мясцінах. З паштовак мы даведваемся пра тое, дзе, у якіх гарадах Польшчы, Украіны, Беларусі ў гонар ваеначальніка былі названы вуліцы, дзе ў Аўстраліі знаходзіцца гара Касцюшкі… Такія знаходкі дапамагаюць уявіць усю значнасць і шматаблічнасць постаці легендарнага кіраўніка паўстання 1794 года.

…Вярнуўшыся з ЗША, амерыканскі генерал атрымлівае прызначэнне ў армію Польшчы, хаця, як вядома, сам ён хацеў служыць у арміі Вялікага Княства Літоўскага. У 1792 годзе генерал-маёр Касцюшка становіцца камандзірам адной з трох дывізій войска пад камандаваннем Юзафа Панятоўскага. Пад Фаставам, Жытомірам, Белаполем, Шапятоўкай, Астрогам, Дубнам ваюе з арміяй рускага цара. Атрымлівае чын генерал-лейтэнанта, узнагароджваецца ордэнам "Віртуці Мілітары". І ўсё ж 30 ліпеня 1792 года наш зямляк падае ў адстаўку. Але патрыятычныя памкненні не пакідалі ўраджэнца Косава. Генерал шмат ездзіць па Польшчы, гарадах еўрапейскіх краін, гуртуе вакол сябе адданых ідэям свабоды і незалежнасці паплечнікаў. І ў хуткім часе ўзначальвае агульнанацыянальнае паўстанне. Пад камандаваннем Касцюшкі паўстанцы атрымліваюць шэраг перамог. У прыватнасці, пад Рацлавіцамі ў красавіку 1794-га… Літаральна дзясяткі старых паштовак раскрываюць перад намі даўнія падзеі. Рэпрадукцыі могуць служыць выдатнымі ілюстрацыямі не толькі на школьных уроках гісторыі. У Рацлавіцы красавіка 1794-га могуць зазірнуць усе, хто сур'ёзна вывучае ваеннае мастацтва. Можна толькі здагадвацца, якіх высілкаў каштавала калекцыянеру знайсці такія паштоўкі. Уладзімір Ліхадзедаў зборам матэрыялаў да альбома, прысвечанага Касцюшку, памяці пра славутага земляка, аддаў доўгія гады. Дзеля гэтага аб'ездзіў многія гарады, пабываў на розных аукцыёнах, кантактаваў з калекцыянерамі самых далёкіх краін. У выніку да чытача прыйшло ўнікальнае выданне з "адрасамі Касцюшкі" па ўсім свеце.

Жыццёвы шлях героя ў апошнія гады жыцця быў ізноў звязаны з ЗША, а затым Францыяй, Швейцарыяй. Да меркаванняў Касцюшкі як вядомага палітычнага і ваеннага дзеяча прыслухоўваліся і яго праціўнікі. У 1815 годзе наш зямляк сустракаўся ў Швейцарыі з расійскім імператарам Аляксандрам I, па яго даручэнні вёў перамовы з князем Адамам Чартарыйскім у Вене. Памёр амерыканскі і польскі генерал у Салюры ў Швейцарыі. І гэты горад, таксама як і іншыя мясціны Швейцарыі (Біль, Люцэрн, Базель, Рыгі-Кульм, гара Пілятус), — на паштоўках з кнігі Уладзіміра Ліхадзедава. Дарэчы, на апошняй старонцы вокладкі адметнага з розных пунктаў гледжання выдання — словы вядомага ва ўсім свеце палітыка Збігнева Бжэзінскага (ён меў магчымасць пазнаёміцца з кнігай да яе выхаду ў свет): "Гэта — цікавы і пазнавальны расповед пра жыццё дзіўнага героя двух брацкіх народаў — беларусаў і палякаў, які змагаўся не толькі за іх свабоду, але і за свабоду амерыканцаў. Адданасць Касцюшкі правам чалавека, сацыяльнай справядлівасці і нацыянальнай незалежнасці — гэта вечнае сведчанне яго гістарычнай значнасці". І гэта якраз даказвае кніга Уладзіміра Ліхадзедава "Тадэвуш Касцюшка на старых паштоўках і ў графіцы".

© В поисках утраченного

Паштоўкі з калекцыі Уладзіміра Ліхадзедава

БЕЛТА

Пад час фестывалю старажытнай культуры ў Мсціславе можна сустрэць і рыцараў, і прыгожых паненак

Яскравыя танцы на Замкавай гары

Фестываль вярнуў Мсціслаў у Сярэднявечча

Традыцыйны фестываль старажытнай культуры прайшоў у горадзе Мсціславе. Асноўныя дзеі разгарнуліся на бастыёне сярэднявечнай эпохі — Замкавай гары. Пачаліся ўрачыстасці з набажэнства ў памяць пра воінаў-мсціслаўцаў, якія загінулі на палях бітваў у шматлікіх войнах.

Захапленні па душы знайшлі ўсе госці: "Горад майстроў", атракцыёны, кірмашы, выставы, лялечныя спектаклі, канцэртна-забаўляльныя праграмы не далі сумаваць нават самым патрабавальным гледачам. Можна было далучыцца да шматлікіх экскурсій. Кінаманы змаглі паглядзець гістарычныя фільмы.

Кульмінацыяй свята стала шэсце рыцарскіх клубаў з цэнтральнай плошчы да помніка Пятру Мсціслаўцу. Пасля гэтага пачаліся самі спаборніцтвы. Турніры мечнікоў і лучнікаў перамяжоўваліся сярэдневяковымі танцамі. Дарэчы, сярод рыцараў былі і суседзі са Смаленскай вобласці Расіі. На Замкавай гары прайшоў конны турнір і "штурм цытадэлі". Да наступнага года ўдзельнікі развіталіся з фестывалем фаер-шоу і феерверкам.

Смачны пачастунак

У Полацкім раёне прайшло адметнае свята

Бульбяны фестываль адбыўся ў аграгарадку Кушлікі — на цэнтральнай сядзібе адной з найбуйнейшых на Віцебшчыне бульбяных гаспадарак. Прыехалі на свята вясковыя і гарадскія жыхары з усяго раёна. Многія з іх падрыхтавалі свае фірмовыя бульбяныя стравы. У фестывалі прымалі ўдзел таксама фермерскія гаспадаркі, прыватныя падворкі — адным словам, усе жадаючыя. Іх чакала мноства конкурсаў, спаборніцтваў, забаўляльных праграм. Самыя ўдачлівыя атрымалі прызы і дыпломы.

ПРА ШТО СЛОВА ГАВОРЫЦЬ

Загадкі роднага склону

Нездарма ўсё ж лінгвістыку некаторыя вучоныя адносяць да навук дакладных. І сапраўды, многія, напрыклад, матэматычныя метады і формулы прымяняльныя і ў мовазнаўстве. Ёсць нават дысцыпліна такая: матэматычная лінгвістыка. Для чаго такія разважанні, спытаеце? А каб падвесці да невялікага лінгвістычна-матэматычнага эксперыменту ў вывучэнні адной з самых складаных і спрэчных тэм у беларускай мове — канчаткаў назоўнікаў у родным склоне адзіночнага ліку.

А трэба пісаць (вымаўляць) або **у**? Вось у чым пытанне!

Са школы мы засвойваем, што **зборныя, прасторавыя, рэчыўныя, абстрактныя назоўнікі звычайна пішуцца з канчаткам –у**, акрамя нешматлікіх выключэнняў. Напрыклад, *маладняк — маладняку, лес — лесу, кісларод — кіслароду, працэс — працэсу*. Аднак *хлеба* і *аўса*.

Паўстае пытанне: чаму ж тады ў некаторых выпадках правільна *схода*, а ў пэўных — *сходу*, як і *з'езда — з'езду, перахода — пераходу, пераезда — пераезду*?

Уся справа ў сэнсе, значэнні, якое выражае слова ў тым ці іншым выпадку. Так, пасля аналізу некаторых ужыванняў назоўнікаў роднага склону адзіночнага ліку выявіліся пэўныя заканамернасці, паводле якіх можна скласці лінгвістычныя прапорцыі. Яны, дарэчы, некаторым могуць вельмі аблегчыць запамінанне правіла.

Такім чынам, спачатку растлумачу гэта на словах, а потым і матэматычнай мовай.



Калі мы возьмем назоўнікі *сход* і *з'езд*, то абодва маюць, па-першае, значэнне 'збор прадстаўнікоў пэўных вялікіх арганізацый, катэгорый насельніцтва, які мае грамадска-палітычны або навуковы характар'. А другое іх значэнне — 'дзеянне паводле дзеясловаў (адпаведна) *сходзіць* і *з'ехацца*'. У першым значэнні ў родным склоне назоўнікі *сход* і *з'езд* набываюць канчатак –а, а ў другім — -у.

Вось і прапорцыі:

I. -а/-у * 'збор людзей'/ сход (з'езд) = -а

II. -а/-у * 'дзеянне паводле дзеяслова'/ сход (з'езд) = -у

Паспрабуйце запомніць гэтую прапорцыю, матэматыка можа дапамагчы вам у засвойванні лінгвістычнай інфармацыі. Плёну ў вывучэнні мовы!

Падрыхтавала
Вераніка Бандаровіч

КРЫЖАВАНКА

Зорка Венера ўзышла...

Да 120-годдзя з дня нараджэння Максіма Багдановіча

Па гарызанталі: 1. "Не іскрыцца …,\ Не цвіце трава чабор". З верша Янкі Купалы "Адцвітанне". 3. Свой дварочак, як … (прык.). 8. Курорт у Крыме, дзе ўстаноўлены помнік беларускаму паэту Максіму Багдановічу. 9. Першы твор М. Багдановіча, які быў напісаны на беларускай мове і надрукаваны ў 1907 годзе ў "Нашай Ніве". 10. Літаратурны жанр, у якім, як і ў публіцыстыцы, праявіўся талент паэта. 13. "А … спаткаў іх халодным дажджом". З верша "Астры". 14. "… пранёсся на крылах,\ Стракочуць конікі ў траве". З верша паэта "Блішчыць у небе зор пасеў". 17. Зборнік вершаў паэта, выдадзены ўпершыню ў Вільні пры грашовай падтрымцы княгіні Магдалены Радзівіл. 18. "Светла …\ Стаўпамі падае праз вузкае аконца". З верша "Перапісчык". 21. "Прывет табе, … на волі!". Верш М. Багдановіча. 22. Змітроўскія … Прысвятак беларускага народнага календара, адзначаўся 5 лістапада. 26. "Ціхім срэбрам грукае …". З верша "Добрай ночы, зара-зараніца". 27. Горад на Міншчыне, паблізу ад якога ў вёсцы Халопенічы нарадзіўся бацька паэта, беларускі этнограф, фалькларыст Адам Багдановіч. 28. Міжнародная арганізацыя, якая ўнесла імя М. Багдановіча ў каляндарны спіс "Гадавіны славутых асоб і людзей" (абрэв.). 29. "І вось у спомінах устане, ажыве,\ Калі знайдуць маё няхітрае …". З верша "Летапісец". 30. "…, доктар лекарскіх навук". З верша "Безнадзейнасць".

Па вертыкалі: 2. "… Венера". Опера, якую прысвяцілі М. Багдановічу кампазітар Ю. Семяняка і паэт А. Бачыла. 4. "Прыпадыме бацька…\ На хрыбце магутным лёд". З верша "Перад паводкай". 5. Імя пісьменніка Бядулі, на кватэры якога жыў паэт у 1916 годзе. 6. "Ракуцёўскае …". Свята паэзіі і песні, прысвечанае творчасці паэта, якое штогод ладзіцца ў ліпені ў вёсцы Ракуцёўшчына, у Маладзечанскім раёне. 7. Вялікае пачуццё, якое адчуваў паэт да яраслаўскай знаёмай Ганны Какуевай, якой прысвяціў цыкл вершаў "Мадонны". 11. "То не траўка-павіліка расплятаецца –\ Наша вернае … канчаецца". З паэмы "Максім і Магдалена". 12. Лад душы М. Багдановіча, якім пранізаны ўсе яго творы. 15. Адвагаю і … пярэйдзеш (прык.). 16. "… круглы ўстаў на небе". З верша "Вечар". 19. "Мы на … вянок ім спляцём". З верша Янкі Купалы "Песня жнеяў". 20. "З гэтых дзядоў суворых … нам бы ўзяць". З верша М. Багдановіча "Нашых дзядоў душылі абшары лясоў". 23. "Ключ у мора- … кідаю". З верша "Ціхі вечар, знікнула спякота". 24. "Не … у трубу ўструбіў". З верша М. Багдановіча "Страцім-лебедзь". 25. Жылое памяшканне на судне.

Падрыхтаваў
Лявон Целеш



Адказы на крыжаванку

Па гарызанталі: 1. Небазор. 3. Вяночак. 8. Місхор. 9. "Музыка". 10. Крытыка. 13. Ранак. 14. Кажан. 17. "Вянок". 18. Сонца. 21. Жыццё. 22. Дзяды. 26. Крыніца. 27. Крупкі. 28. ЮНЕСКА. 29. Пісанне. 30. Скарына.

Па вертыкалі: 2. Зорка. 4. Нёман. 5. Змітрок. 6. Лета. 7. Каханне. 11. Каханніца. 12. Рамантызм. 15. Пекла. 16. Месяц. 19. Дажынкі. 20. Прыклад. 23. Акіян. 24. Анёл. 25. Каюта.

Заснавальнік: Установа Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «Рэдакцыя газеты «Советская Белоруссия»
Рэдактар Віктар Міхайлавіч Харкоў
Адрас: пр. Незалежнасці, 44, Мінск, 220005
Рэгістрацыйнае пасведчанне № 61
Тэлефон рэдакцыі: +375 17 288 17 82; факс: +375 17 290 68 31
Бюро па рэкламе: Тэл. +375 17 290 60 11
E—mail: golas_radzimy@tut.by
Газета надрукавана на Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку»
Аб'ём выдання: 1 друк. арк.
Тыраж: 1945, **Заказ:** 844
Час падпісання ў друк: 20.10
Выходзіць 1 раз на тыдзень
Пазіцыі рэдакцыі і аўтараў, матэрыялы якіх друкуюцца на старонках "Голасу Радзімы", могуць не супадаць.
© "Голас Радзімы", 2011